


# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я.КУПАЛЫ

№ 7 (217) 30 снежня 1994 года, пятніца





## Скора, скора Новы год!

***Яшчэ некалькі дзён, і ў кожную сям'ю, быццам з далёкай дзіцячай казкі, прыйдзе Дзед Мароз з цудоўным падарункам пад навагоднюю ёлку і добрымі пажаданнямі.***

***І як заўсёды, на апрануўшыхся ў пышнае адзенне вуліцах, плошчах горада заблішчаць раскошныя феерверкі, прыгожая ілюмінацыя, і мноства шчаслівых усмешак ва ўрочны час - 31 снежня -скажуць: «Бывай, год 1994!».***

***Шаноўнае спадарства! Нашы паважаныя чытачы!***

***У навагоднюю ноч мы жадаем, каб сярод вас не было ані злосці, ані нянавісці, ані карысці, ані зайздрасці!***

***І якой няпэўнай вам ні здавалася б будучыня - ўсё ж запаліце святочныя свечкі, забудзьце крыўды і непрыемнасці года мінулага, падумайце аб тым, што ўрэшце рэшт усё будзе цудоўна. А калі не верыце - проста задумайце жаданне, і ў навагоднюю ноч яно абавязкова спраўдзіцца!***



- Ці будуць у 1995 годзе свіныя адбіўныя?

- Так, будуць. Гэта будзе бульба, адбітая ў свіней.

* * *

Сын воўка заўседы будзе воўкам, сын прафесара можа быць баранам.

* * *

Парада студэнту: калі выкладчык адмеціў, што ты спісваеш, працягвай нахабна спісваць. Ён не паверыць сваім вачам, і ты будзеш уратаваны.

* * *

- Чым студэнт адрозніваецца ад гусара?

- Падчас хадзьбы гусар шпорамі звініць, а студэнт - шалясціць.

* * *

На фізіка-інжынерным факультэце зроблены арыгінальны будзільнік. Першыя дзесяць хвілін ён звініць нармальна, другія дзесяць хвілін імітуе гук працуючага касмічнага рухавіка, а апошнія дзве хвіліны - голас дэкана факультэта.

* * *

- Ці можна скрыжаваць карову с мядзведзем?

- Не толькі можна, але трэба. Зімой яно будзе смактаць лапу, а летам даваць малако.

**Л.М.Півач**, рэктар:

***«Віншую студэнтаў, выкладчыкаў і супрацоўнікаў з Новым годам! Жадаю ўсім моцнага здароўя. Спадзяюся, што ў гэты нялёгкі час мы разам, усёй грамадою будзем працаваць на наш універсітэт, на яго будучыню. Разам лягчэй адолець дарогу. Крызісы праходзяць, застаюцца людзі і іх справы. З Новым годам, сябры, з новым шчасцем!»***



**В.М.Гарбузаў**, прарэктар па вучэбнай рабоце:

***«Я не люблю гучныя словы,але сёння ад усёй душы хачу павіншаваць усіх з наступаючым святам - Новым годам і пажадаць нязгаснага шчасця ў 1995 годзе!»***



**І.П. Мартынаў**, дэкан матэматычнага факультэта:

***«Каб спасцігнуць гармонію сусвету, пазнавайце паэзію матэматыкі. Толькі ў матэматыцы гармонія ёсць!».***



**І.В. Гушчын**, дэкан факультэта права і эканомікі:

***«Пусть на льдинный поднос***
***В Новый год Дед Мороз***
***Вам серебряный кубок поставит,***
***Золотого здоровья нальет,***
***На закуску веселья оставит!»***



Грузін цягне ў самалёт барана.

Пілот у яго пытаецца:

- Чаму цягнеш барана?

- Якога барана? Баран у мяне ва універсітэце вучыцца. А гэта - сувенір.

* * *

На паўторным экзамене дацэнт папярэджвае студэнта:

- Давайце, Іваноў, у гэты раз без дурняў.

- Добра, тады я вазьму накіраванне да другога выкладчыка.

* * *

Студэнт звяртаецца да бібліятэкара:

-Мне, калі ласка, «Капітал» Карла Маркса. Пажадана ў валюце.

* * *

- Біл, ты з гэтай цыгарэтай змахваеш на ідыёта.

- Добра, Джэк, я буду змахваць у другі бок.

* * *

- Афіцыянт, гэтыя мухі ў вашай сталоўцы мяне раздражняюць!

- Скажыце, якія канкрэтна, і я іх адлаўлю!

* * *

Адзін каўбой кажа другому:

- Кажуць, ты ўступіў у «Ачышчэнне?»

Той з брыдкасцю аглядае падэшву бота:

- Дзе?

Рэдактар - літсупрацоўніку:

- Гэты артыкул трэба скараціць на 200 радкоў.

- Но ў ім усяго 200 радкоў!

- Менавіта гэта я маю на ўвазе.

* * *

- Скажы, Алесь, як завецца чалавек, які гаворыць і працягвае гаварыць, нават калі яго ніхто не слухае?

- Настаўнік, спадар настаўнік!

* * *

Настаўнік батанікі пытаецца ў пяцікласніка:

- Як размнажаюцца расліны?

- Расліны? Вось аб іх я як раз і не ведаю...

* * *

На экзамене прафесар пытаецца ў студэнта:

- Вы ведаеце, што такое экзамен?

- Гэта гутарка двух разумных людзей, - адказвае студэнт.

- А калі адзін з ніх ідыёт? - цікавіцца прафесар.

- Тады другі не атрымае стыпендыю, - спакойна адказвае студэнт.

* * *

Выкладчык пытаецца ў студэнта:

- Чаму вы спазніліся на лекцыю?

- Таму што яна пачалася перад тым, як я ўвайшоў у аўдыторыю!

* * *

Хірург пытаецца ў пачынаючага ўрача:

- Ну як у вас прайшло анатаміраванне, калега?

- Анатаміраванне? Якое анатаміраванне? Гэта я рабіў аперацыю...



**І.І. Вялента,** дэкан гуманітарнага факультэта:

***« У Новым годзе няхай усе жанчыны адчуваюць сябе Снягуркамі і няхай вакол іх знаходзяцца кахаючыя іх, як Дзед Мароз дзяцей, мужчыны!».***



**В.М.Чарапіца,** дэкан факультэта гісторыі і культуры:

***« Новы год мы заўсёды чакаем з усхваляванай надзеяй, што ўсё лепшае ў нашым жыцці спраўдзіцца. Іхай гэтае чаканне навізны будзе для ўсіх нас не проста чаканнем, а нястомнай працай дзеля дасягнення задуманага!».***

**Л.В. Рычкова,** дэкан факультэта замежных моў:

***«Жадаю універсітэту з поспехам вытрымаць не толькі атэстацыю, але і акрэдытацыю, факультэту - трывала стаць на ногі, ну а ўсім нам - быць шчаслівымі, нягледзячы ні на што!».***



**А.К.Краўцэвіч,** першы прарэктар:

***« Віншую ўсіх з Новым годам. Зычу студэнтам шчаслівай сесіі, выкладчыкам добрых заробкаў, а усім разам - пераждыць цяжкую зіму і дачакацца ў 1995 годзе пераменаў да лепшай долі!».***



Прафесар-біёлаг чытае лекцыю студэнтам:

- Абсалютна відавочна, што першыя дзве гадзіны ў жыцці любой жывой істоты з'яўляюцца для яе найбольш небяспечным перыядам...

Адзін са студэнтаў перапыняе яго пытаннем:

- А не здаецца вам, што і апошнія дзве гадзіны не пазбаўлены пэўнай рызыкі?

* * *

Настаўнік вучню на ўроке працы:

- Ты б'ешь малатком, як маланка!

- Вы жадаеце сказаць, што я так хутка працую?

- Не, проста маланка таксама ніколі не трапляе ў адно і тое ж месца!

* * *

- Кожную раніцу званок будзільніка на мяне ўздейнічае, як стрэл.

- І ты адразу ж ускокваешь?

- Не. Ляжу, як забіты.

* * *

Студэнтка, выходзя з аўдыторыі, дзе здавалі экзамен:

- Фу, нарэшце здала!

Прафесар, выціраючы пот з ілба:

- Гэта я здаўся!

# Дні

***Студэнцкае жыццё для кожнага чалавека не ўяўляецца без свята. Такімі ў Гродзенскім дзяржаўным універсітэце з'яўляюцца дні факультэтаў, якія увайшлі ў традыцыю ужо вельмі даўно. Сярод факультэтаў асаблівае месца займае матэматычны факультэт, які не адзначаў гэтае свята з 1989 па 1993 год. Але традыцыя не згасла.***

***Восенню 1993 года студэнты чацвёртага /сёння пятага/ курса сабраліся ў цесным коле і вынеслі вердыкт: пакуль мы вучымся ва ўніверсітэце, Дням матфака быць!***

***Адбыўшыяся ў канцы 1993 года Дні матэматычнага факультэта прайшлі ў сяброўскіх, святочных і вясёлых абставінах.***

***Аднак мы былі не зусім задаволены: здавалася, што свята прайшло не так, як нам гэтага жадалася.***

***Гэтае пачуццё незадаволенасці не давала нам спакою, пакуль мы зноў не сабраліся і не вырашылі правесці Дні матфака ў другі раз. І вось што з гэтага атрымалася...***

Дні матфака пачаліся з прэс-канферэнцыі з выкладчыкамі. Гэтаму папярэднічаў адлоў выкладчыкаў па кафедрах з дапамогай дэкана. Іх супраціўленне было зламана ўпартым націскам студэнтаў. Удалося сагнаць 8 выкладчыкаў. Яны і паўсталі перад вачыма студэнтаў, якія адчувалі прыемнасць наперад ад будучай расправы. Яны мелі магчымасць задаць пазаганяным выкладчыкам любое пытанне ананімна альбо з дапамогай запіскі, у нечаканым выпадку схаваўшыся за шырокую спіну вядучага Андрэя Садоўскага.



Больш за ўсё пытанняў, як водзіцца, было задана дэкану. Высветлілася, што ён яшчэ і вершы складае, а яшчэ і паспяхова іх дэкламуе. А Аляксандра Мікалаевіча Мятліцкага западозрылі ў тым, што ён бараду адрасціў, каб ад міліцыі хавацца альбо быць падобным да лідэра БСДГ Трусава. Валерыя Іванавіча Булгакава параўнавалі з Майстрам і спыталіся, а дзе ж яго Маргарыта, на што знаходзячаяся на сцэне яго жонка Святлана Апыцкая ледзь не адрэагавала належным чынам. Увогуле настойлівасці некаторых таварышаў можна толькі пазайздросціць. У Аляксандра Васілевіча Карлюкова, напрыклад, двойчы спыталіся (зразумела, ананімна і ў пісьмовым выглядзе), што для яго лягчэй - кінуць матэматыку альбо кінуць курыць? На гэта ён з ноткай гонару ў голасе адказаў, што ні таго, ні іншага кідаць не збіраецца.

Увечары таго ж дня праводзілася урачыстае пасвячэнне першакурснікаў у студэнты матэматычнага факультэта. Яно прайшло ў сяброўскай, святочнай атмасферы. Перш-наперш іх павіншаваў дэкан Іван Платонавіч Мартынаў, а потым хахмілі старшакурснікі. Карацей, было цікава.



У сераду, на другі дзень, у актавай зале адбыліся захапляльныя спаборніцтвы - «Брэйн - рынг» паміж камандамі выкладчыкаў «Тутэйшыя» і «Сябры». Яны ў каторы раз прадэманстравалі, што матэматычны факультэт з'яўляецца ўзорным у ажыццяўленні Закона аб мовах. Галоўны «тутэйшы» Аляксандр Мікалаевіч Мятліцкі як сапраўдны лоцман правёў даверaных яму выкладчыкаў паміж рыфамі каверзных студэнцкіх пытанняў. У выніку «Сябры» былі разбіты ўшчэнт з лікам 9,5:3,5, што, аднак, нічуць не прымяншыла іх дастойнай ігры. Кожны іх правільны адказ сустракаўся шквалам апладысментаў, якім мог бы пазайздросціць і Майкл Джэксан.



Увечары трэцяга дня адбыўся канцэрт бард-рок-групы «Ноеў каўчэг». Адкрыў праграму вядомы спявак Яўген Фалееў сваімі смелымі і вясёлымі песнямі. Ён спеў песні, з якімі выступаў у Ізраіле, што пацвярджае інтэрнацыянальнасць гумару.

Пасля разагрэву публікі пачала сваё выступленне група «Ноеў каўчэг». Яе праграма была пабудавана на аснове твораў Томсана, дзе людзі параўноўваюцца з ваўкамі. Усё гэта было аформлена песнямі з прывабнай музыкай у добрым выкананні.

А кульмінацыяй Дней матфака з'явілася новая грандыёзная супершоў-праграма «Гуляць дык гуляць!». Увогуле гэтая назва выяўляе сэнс усяго студэнцкага жыцця.

Спачатку на сцэне з'явіліся «старыя» матфака ў асобе пяцізорачнай брыгады 2-гадовай вытрымкі, складзенай з пяцікурснікаў з украпінамі чатырохкурсніц. У сярэдзіне праграмы гледачы ўбачылі «матэматычных выкапняў», прадстаўшых у выглядзе вечнамаладых інвалідаў. Гэта былі выпускнікі факультэта, заставіўшыя яго ў розныя гады. Перапоўненая зала на 800 месц, выбухаўшая апладысментамі з вельмі малым перыядам, была сведкай таго, што вечарына атрымалася сапраўды выходзячай за звычайныя рамкі іншых універсітэцкіх выступленняў. Па заканчэнні тэатральнай часткі выступіла група «Jungli Christmass» з экзатычным салістам з Афрыканскага кантыненту. Ён паспяхова канкураваў з дыскатэкай, адначасова адбываўшайся ў холе. Застаецца дадаць, што спонсарам, які аплаціў арэнду залы Гарадскога дома афіцэраў, дзе праходзіла завяршальная праграма «Гуляць дык гуляць!», была фірма «5+».

---

**Матэрыялы развароту падрыхтавалі: Аляксандр Грынь, Андрэй Садоўскі, Юры Іохаў (фота).**





# матфака

Мятліцкі Аляксандр ,
ст.выкладчык кафедры АГ і ММ

## Надзённае

(выступ на вечарыне, прысвечанай
Дням матфака)

*Віншую вас, народ матфака!*
*З вялікім святам, спадары!*
*Прабачце, што прыйшоў без фрака -*
*Сюды я з лекцыі забрыў.*
*Свой фрак мо іншы раз накіну,*
*Калі што будзе апранаць...*
*Чаму ж улез на гэту сцэну,*
*Хачу вам шчыра расказаць.*
*Аднойчы неяк не ў гуморы,*
*Бо цяжка зранку працаваць,*
*Убачыў Грыня ў калідоры -*
*Яго ж заўжды здалёк відаць.*
*Мяне спыніў ен, кажа: «Дзядзька!*
*Тут Дні матфака на насу!*
*Во каб выкладчыкаў сабраць нам -*
*Хай гумар у масы панясуць,*
*Канцэрцік зробяць вечаровы,*
*Мо што затанчаць, што спяюць,*
*Студэнтам скажуць два-тры словы,*
*Чаму яны яшчэ жывуць».*
*Кажу: « Сашок, ты што, пад газам?*
*Бо трэба ж зранку так загнуць!*
*Лягчэй тэр.-мех. здаць спершаразу,*
*Чым нас на сцэну зацягнуць».*
*Але ж вы ведаеце Грыня -*
*ўпарты хлопец, што й казаць.*
*Свайго даб'ецца - не астыне,*
*Таму і вучыцца на пяць.*
*Згадзіўся я з такім пачынам,*
*Пачаў па кафедрах блукаць,*
*Падумаў: усё ў наш час магчыма -*
*Мо і на дудцы стаў хто граць?*
*Зайшоў адразу на дыфуры -*
*Там люд вясёлы, малады.*
*Ды выйшаў я адтуль пануры:*
*«Вось каб банкецік, дык тады б...»*
*Сказалі мне:«А дзе ж мільёнчык,*
*Каб той банкецік запусціць?*
*Як той казаў: «Лягчэй у студні*
*Вядром падлешчыка злавіць!»*
*Пайшоў да фізікаў плячыстых,*
*Пагрукаў у хату Белыха.*
*Кажу:« Мо тут ёсць гарманісты*
*Альбо прыхільнікі «стиха»?*
*«Які там верш, які гармонік?» -*
*Пачуў у адказ ад Белыха,-*
*«Хай на экзамены іх гоняць,*
*Там мы і зробім ім «ха-ха»,*
*І самі ўволю пасмяемся,*
*Як прыйдуць метады здаваць...*
*Ды навогул, жыццё такое,*
*Што лепш не пець, а завываць».*
*Яно і праўда, устанеш зранку,*
*ў пустой лядоўцы знойдзеш штосьць,*
*Ну, там кефір ці абаранак -*
*Тым і снядаеш, ягамосць!*
*Пясешся ў мыле на тралейбус -*
*ў яго спрабуй яшчэ папасць!*
*А як прыцісне які бэйбус -*
*Дык косці, як галлё, трашчаць!*
*Нарэшце выпхнуць на прыпынку -*
*Ну, дзякуй богу, што жывы!*
*Пасля такога «адпачынку»*
*Нядоўга і ваўком завыць.*
*Да аўдыторыі пляцешся,*
*Каб працу ў пару пачаць,*
*А там... - ты дарам, брат, смяешся -*
*Сядзіць студэнтаў гэтак... з пяць!*
*І так салодка пазяхаюць,*
*Хоць разам з імі пазяхай...*
*Відаць, начамі дзе гуляюць,*
*Хоць на двары даўно не май.*
*«А дзе астатнія? Паснулі,*
*Як тыя пчолы на зіму?*
*Ці вечарком занад гульнулі*
*І зранку хворыя таму?»*
*Мне кажуць: «Гэта абібокі,*
*Іх мала зараз сярод нас.*
*У асноўным люд у край далекі*
*Якраз імчыць у гэты час.*
*Адны ў Турцыю рванулі -*
*Там маюць скурны інтарэс.*
*Другія ў Польшчу сiганулі*
*На рэкецiраўскi кангрэс».*
*А я ў адказ: «Ну, з імі ясна!*
*То нашы «лепшыя сыны»!*
*А дзе ж слабейшыя ў навуках?*
*Куды панесліся яны?»*
*Між тым ля гэтых,ля Гібуліч*
*Амаль штодня вірыць кірмаш.*
*Народу там - што пчол у вуллі.*
*Шчыруе і студэнцік наш.*
*Што там здае? - у яго спытайце.*
*Дык не канспектыкі ж свае.*
*Мяркую, тое, што купляюць,*
*То ён, гаротны, і здае.*
*Даляры здасць, пасля - залікі*
*З заходу пятага здае.*
*Так і марнуе без уліку*
*Гады найлепшыя свае.*
*А што рабіць?Хоць кратай у вуха,*
*Хоць ты у Менск пішы лісты -*
*З адной дзяржаўнае сцяпухі*
*Даўно б адкінуў капыты.*
*Відаць, пара ўжо дэканату*
*Вучэбны план крыху змяніць,*
*Так, каб практычныя занят кі*
*Бліжэй да рынку нахіліць.*
*Каб знаў студэнт, як з той валіскі*
*Зрабіць адметны бікампакт,*
*А абнаглеўшых канкурэнтаў*
*Раскласці ў «Тейлоров ряд».*
*І як знайсці нармальны дзельнік,*
*Каб групу баксаў падзяліць...*
*Ды і наогул, задач хапае -*
*Што тут замнога гаварыць.*
*Такія думкі ахінаюць,*
*Калі ў міжпар'і з сябруком*
*З заняткаў гэткіх у адчаі*
*У курыльню чэшам прамiком.*
*Студэнтаў там, як мух улетку.*
*Сам Карлюкоў не дасць зманіць.*
*Такія цмокчуць цыгарэткі,*
*Што нам ніколі не купіць.*
*Дасталі й мы свой «Бэбі-Кэнал»*
*І як пыхнулі раз дымком...*
*Што пачалося! Кашаль, вэркал -*
*Відаць, атруцілі сынкоў!*
*Дакуркі кінуўшы ў кішэні,*
*Бо сорамна ж дзяцей труціць,*
*Далі мы цягу з той каптэльні,*
*Каб дзе ў зацішку дасмаліць.*
*Такія вось наўкол студэнты,*
*Такі жыццёвы іх урок.*
*Цяпер ужо й абітурыенты*
*Абы-куды не зробяць крок.*
*Адзін казаў : «А я з дзяцінства*
*Жадаў хабарнікаў лавіць.*
*Мяркую на юрфак убіцца -*
*Бо добра пракурорам быць!»*
*Другі з пялюшак ужо імкнецца*
*На міжнародны менэджмент,*
*Бо трэба ж дзе-нідзе прыгрэцца*
*ў гістарычны наш «момент».*
*А той з дзяцінства ладзіць флюгер -*
*Яго дарога на гістфак.*
*Там што ні год - то без напругі*
*Адзін і той жа круцяць факт.*
*У нас жа іншыя законы,*
*Навуку нашу не спіхнеш -*
*Як выўчыш формулу Герона,*
*З ёй будзеш жыць, пакуль памрэш.*
*Няхай наўкол жыцця віхуры*
*І палітычнае выццё,*
*Жылі і будуць жыць дыфуры!*
*І гэта, брат, не пачуццё!*
*Бо матэматыка - навука,*
*А не якісьці балаган.*
*Ей не патрэбен лішні грукат,*
*Яна інэртная сцягам.*
*На гэтай вось узнёслай хвалі*
*Адзначу я адзін аспект:*
*Як не круці, а мы трапілі*
*На самы лепшы факультэт!*
*З тым і віншую вас,панове!*
*І каб тут многа не сіпець,*
*Скажу: часы настануць унове,*
*Калі захочацца і спець.*







Ва універсітэце праводзіцца сацыялагічнае апытанне.

Пытаюцца ў студэнта дзённага аддзялення:

- За які тэрмін вы здолееце вывучыць кітайскую мову?

- Ну, магчыма, за год...

У студэнта-вячэрніка:

- За які тэрмін вы здолееце вывучыць кітайскую мову?

- Ну, магчыма, за паўгода...

У студэнта-завочніка:

- За які тэрмін вы здолееце вывучыць кітайскую мову?

Студэнт дастае заліковую кніжку і на бягу пытаецца:

- А ў якой аўдыторыі здаваць?

* * *

- Якая розніца паміж вераб'ём і салаў'ём?

- Верабей - той жа салавей. Толькі кансерваторыю ён заканчваў завочна.

* * *

Суддзя здзіўлены, што ўсе дванаццаць прысяжных вынеслі падсуднаму вердыкт - невінаваты.

- Па якой прычыне? - пытаецца ён.

- З прычыны прыдуркаватасці, - адказвае старшыня прысяжных.

- Што, ва ўсіх дванаццаці?



**Н.В.Паўловіч,** дэкан факультэта біялогіі і экалогіі:

***«Хочацца, каб ува ўсіх добрых людзей у Новым годзе было больш падстаў для радасці, усмешак, добрага настрою. А каб было за што зачапіцца душой у гэтым свеце, жадаю разумення, чуйнасці, цеплыні з боку блізкіх, сяброў і калег!»***

**Г.А. Гачко,** дэкан фізіка-тэхнічнага факультэта:

***«У жыцці шмат праблем. Жадаю ўсім вырашаць іх у парадку паступлення. Інакш застанецца толькі «... збіраць маркі».***





**В.П. Таранцэй,** дэкан факультэта псіхалогіі і педагогікі:

***« Ад усяго сэрца жадаю ўсім супрацоўнікам факультэта, усяму прафесарска-выкладчыцкаму саставу універсітэта ў Новым годзе здароў'я, шчасця, а галоўнае - поспехаў у справах!».***

Малады муж прыходзіць дамоў і заўважае:

- Зноў ты штосьці спаліла ў кухні?

- Так,- адказвае жонка. - І на гэты раз становішча бязвыхаднае- згарэла кніга «Аб смачнай і здаровай ежы»!

* * *

- Кастусь, я табе падабаюся? - пяшчотна пытаецца Воля ў свайго маладога мужа, які калупае відэльцам у талерцы.

- Дарагая, - мякка адказвае Кастусь, - ты вяртаешся да гэтага пытання кожную раніцу, хаця мы яго высветлілі, здаецца, яшчэ да вяселля. Ты хоць раз за ўвесь мядовы месяц спыталася б, ці падабаюцца мне макароны!

**РЭПЛІКІ**

* Вечны рухавік, ды да яго яшчэ вечны тэрмін гарантыйнага рамонта - вось ідэал тэхнікі.

*Цяжэй за ўсё прызвычайваюцца да нашых поспехаў нашы сябры.

* Не жалейце Сізіфа, яму яшчэ пашчасціла. Уявіце сабе, што яму прыйшлося б яшчэ пісаць справаздачу аб зробленай рабоце.

*Настаўнік - чалавек, які ведае, як выхоўваць чужых дзяцей, лепш, чым сваіх.

* Веды прыходзяць і ўходзяць, а дыплом застаецца.

* Толькі завастрыш пытанне, як адразу ж даюць зразумець, што трэба закругляцца.



## ХТО ЁСТЬ ХТО І ШТО ЁСЦЬ ШТО

*Статыстык: чалавек, які лічыць, што калі галаву ўсунуць у доменую печку, а ногі- у ледзяную ваду, то ўвогуле будзеш адчуваць сябе някепска.

* Эканаміст: той, хто ведае аб грошах значна больш, чым людзі, у якіх яны ёсць.

* Плагіят: гэта калі запазычаешь з адной крыніцы.

*Навуковае даследванне: гэта калі з дзвюх.

*Ілгун: той, хто паведамляе нам непрыемную праўду.

* Знаёмы: той, каго мы ведаем дастаткова добра, каб пазычыць у яго грошай, але недастаткова добра, каб даць яму ў доўг.

*Захапленне: ветлівае прызнанне падабенства да нас.

* Адукацыя: рух ад самаўпэўненасці да задумлівасці, нерашучасці.

* Бюракратызм: майстэрства пераўтвараць магчымае ў немагчымае.

## БРЫТАНСКІ ГУМАР

*Навагоднія пажаданні - гэта няспраўдзіўшыяся мінулагоднія планы.

* Калі ён нарадзіўся, яго бацька доўга кідаў цагліны ў бусла.

* Не спрабуйце абразіць мяне - мяне абражалі высокакваліфікаваныя спецыялісты.

* Ад вас столькі ж карысці, як ад шклянога малатка.

* Я паразмаўляю з вамі пазней. Праз перакладчыка.

* Я не сказаў бы, што ў хаце ў іх вельмі брудна. Я проста раю выцерці ногі, калі будзеце выходзіць з іх кватэры.



**І.В. Жук,** дэкан філалагічнага факультэта:

***«Гады кукарэкаюць, гаўкаюць, нарэшце рохкаюць. Так людзі свядома абмяжоўваюць сябе. Універсітэту нягожа «рохкаць» нават у год Свінні. А таму я жадаю ўсім калегам, усім студэнтам, каб іх розумам і духам апекаваліся не крайнасці абмежаванняў, а наадварот - універсальнасць і свабода».***

**У.М.Карчэўскі,** дэкан факультэта фізічнай культуры:

***«Ніякія лекі ў жыцці не заменяць руху,а рух замяняе ўсе лекі. Жыццё працяглае, калі ўмела ім карыстаюцца, а скарачаем мы яго самі. Таму рухайцеся і падаўжайце сваё жыццё!».***



- Пытанне выклікае у вас цяжкасці? - спытаў выкладчык студэнта, які рыхтуецца да адказу на экзамене.

- Не, зусім не. Пытанне зусім зразумелае. А вось адказ сапраўды выклікае ў мяне цяжкасці.

* * *

Ведаючы, што выкладчык цікавіцца дэтэктывамі, студэнты «выпадкова» даслалі і паклалі на яго стол новы дэтэктыўны раман. Экзаменатар спачатку прагледзеў яго, а затым паглыбіўся ў чытанне, студэнты ж спакойна апрацавалі свае білеты, выкарыстоўваючы, не таячыся,першакрыніцы.

Увайшоў рэктар.

- Сцяпан Сідаравіч, вы іх бачыце? - кіўнуў ён у бок студэнтаў.

- Здагадваюся... іх павінны злавіць... - і не падымаючы галавы, дадаў: - Няхай хаця б раз у год апрацуюць рэкамендаваны матэрыял.

## "Зоркі" на колах

**Цікава было б ведаць на якіх аўто ездзяць нашы славутыя музыканты, выканаўцы поп-музыкі?**

Часцяком музыканты так хутка мяняюць свае ауто, што ўдакладніць, хто і на якой «тачцы» ездзіць сёння, вельмі цяжка. Але на сённяшні дзень расклад адбываецца такі: Юры Шэўчук набыў 5-ю мадэль «BMW», Б.Грэбеншчыкоў («Акварыум») мае старую «VOLVO», А. Іваноў («Ронда») да апошняга часу ездзіў на «восьмерке», але неўзабаве быў вымушаны прадаць машыну. На «Таўрыі» перамяшчаецца Сяргей Галанін (экс -«Брыгада С»), Аляксандр Барыкін круціць абаранку ў роднай «шестерке», а паветраная жанчына - Наталля Вятліцкая мае «Volkswagen-Golf», такі ж аўтамабіль і ў кіраўніка групы «Брава» Яўгена Хаўтана.

Лідэр групы «Дюна» Віктар Рыбін параненйшаму перасоўваецца па дарогах на «Audi -100». У Ірыны Алегравай некалькі тыдняў таму скралі новы «Mercedes-600», і спявачка перасела на сваю старэнькую «восьмерку». Кампазітар Аркадзь Укупнік ездзіць на «Audi-100». А любімец расійскіх школьніц Дзіма Малікаў мае дзве машыны заходняй вытворчасці - «Mercedes» і «BMW».

**("АіФ")**

## АБ'ЯВА

Цэнтр развіцця дзяцей « Здароў'е нацыі» Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы аб'яўляе набор дзяцей 4-6 гадоў у платную нядзельную школу на базе д/с 11 і 64 з навучаннем грамаце, пісьму, матэматыцы, англійскай мове, выяўленчаму мастацтву.

**Запіс па тэл. 5-25-27, 31-05-20.**



*Віншуем з нагоды юбілею!*

ГОРСКУЮ ВЕРУ АЛЯКСАНДРАЎНУ, загадчыцу практыкі універсітэта - з 55-годдзем.

СІДАРЧУК АННУ СЕРАФІМАЎНУ, загадчыцу кафедры матэматыкі і методыкі выкладання матэматыкі ў пачатковай школе - з 55-годдзем.

СТАНКЕВІЧА ВІКТАРА СЦЯПАНАВІЧА, загадчыка бібліятэкі - з 60-годдзем.

СТАШКЕВІЧА УЛАДЗІСЛАВА ЭДВАРДАВІЧА - каменданта вучэбнага корпуса N 1 - з 50-годдзем.

ВАРАБЕЙНІКАВА МІХАІЛА АЛЯКСАНДРАВІЧА - кандыдата юрыдычных навук, дацэнта кафедры крымінальнага права, працэса і крыміналістыкі - з 50-годдзем.

МІНАЙЛАВА МІКАЛАЯ АСТАПАВІЧА, кандыдата педагагічных навук, старшага выкладчыка кафедры педагогікі - з 70-годдзем.

БЛАЖУКЕВІЧ ТАМАРУ АНДРЭЕЎНУ - лабаранта 1-й катэгорыі кафедры агульнай і тэарэтычнай фізікі - з 55-годдзем.

ШЫЦІКА ВІТОЛЬДА КАЗІМІРАВІЧА - кандыдата гістарычных навук, дацэнта кафедры польскай філалогіі - з 60-годдзем.

ГУШЧЫНА ІВАНА ВІТАЛЕВІЧА - доктара юрыдычных навук, прафесара, загадчыка кафедры, дэкана факультэта права і эканомікі - з-60 годдзем.

## ЯК СПЫНІЦЦА МАЦЯРЫЦЦА

*Прывітанне, хлопцы! У мяне праблема. Параіце, калі ласка, як адвучыцца лаяцца. Гэта не жарт. У мяне гэта ў крыві. Я і аднаго сказа без мата сказаць не магу. Сіджу неяк на інфарматыке, настаўніца нешта намалявала на дошке і пытаецца: «Што гэта значыць?» А я ўголас: «Назва файла, тьфу, б..., праграмы!». Што мне рабіць?*

*Ваш чытач Ігар.*

Так, адвучыцца лаяцца, шаноўны Ігар, вельмі цяжка - нават вядомыя палітыкі, артысты, пісьменнікі ніяк не могуць, гэтак «кроюць» па тэлевізару на ўсю краіну. У спектаклях, фільмах гэта накшталт абавязковага атрыбуту. Відаць, час сёння такі - зручны. Але некалькі парад усё ж такі дамо.

Па-першае, калі мацюганне сапраўды ў вас у крыві, лепш за ўсё зрабіць пераліванне. Няхай вам вальюць некалькі літраў крывушкі якога-небудзь прафесара прыгожай славеснасці - адразу загаворыце, як Таццяна Ларына і нават, магчыма, вершамі.

Другі спосаб - эканамічны. Для яго патрэбны добраахвотныя памочнікі. Заключыце з сябрамі дамову - за кожнае моцнае выказванне яны штрафуюць вас на пэўную суму (лепш у СКВ). Праз тыдзень будзеце, як анёлачак. Калі з фінансамі кепска, карыстайцеся варыянтам N 3 - фізічнае ўздзеянне. Дамоўцеся з якім-небудзь культурыстам, каб за кожнае ўжыванне ненарматыўнай лексікі ён даваў вам па галаве. Некалькі дзён - і ў вас можа браць урокі добрага тону англійская каралева. Нязручнасць гэтага метада ў тым, што «выхавальнік» можа трошкі перастарацца і грукнуць мацней, чым трэба. А ну як разам з бруднымі словамі выскачне з галавы і закон Мендэлеева-Клапейрона ці табліца множання? Небяспечна.

Таму ёсць цалкам бяскрыўдны спосаб N 4 - філалагічны. Ужывайце замест мата словы-падмены: назвы раслін, твораў кулінарнага майстэрства ці прозвішчы асабліва любімых палітычных дзеячоў.

Напрыклад: «Хрен тебе! Гончар твою мать! Хорош чигирить!»

Спосаб пяты - лінгвістычны. Можна экспрэсіўна выказвацца на замежных мовах. Гэта ўвогуле крута! Знаёмыя адразу ж заўважаюць: «Дык ты, Сідараў, аказваецца, эстэт». Можна ужываць умерана моцнае англійскае выказванне «кісс май эсс» (пацалуй мяне ў зад), «біч» (кепская цётачка); зграбны французскі выраз «же ман бран» (штосьці накшталт «накакаць мне на гэта»). Спадзяемся, што калі вы прымеце да ўвагі нашы заўвагі, ваш культурны ўзровень адразу папрэ ўгору не горш за долар.

**Практычна не лаючыйся матам Ігар Папоў («АіФ»).**

Рэдактар Н.КРАСНІЦКАЯ

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытатаў, эканамічных даных, асабістых імёнаў, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не падзяляючы пункту гледжання аўтара. Матэрыялы друкуюцца на мове арыгінала.

Наш адрас:
230023, г Гродна, вул. Ажэшкі, 22, пакой 404. Тэл. 44-72-97

Газета выходзіць адзін раз у месяц. Аб'ём газеты - адзін друкаваны аркуш.

Зак. 4301

Наклад 500 асобнікаў.

Газета набрана і звёрстана на камп'ютарнай тэхніке выдавецкага аддзела універсітэта, аддрукавана ў Гродзенскай абласной узбуйнёнай друкарні.

Рэгістрацыйнае пасведчанне 421.

Заснавальнікі: Вучоная Рада універсітэта, прафкам супрацоўнікаў, прафкам студэнтаў.